# Прыкладныя кантрольныя работы

## Беларуская мова

### *Для школ з беларускай мовай навучання*

#### I КЛАС

**Кантрольнае спісванне**

**Май**

Быў месяц май. Буйна цвілі сады. Вакол стаяў іх салодкі пах. У кронах дрэў чулася пчаліная музыка. (18 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Суніцы**

Прыйшло лета. У лесе шмат суніц. Яны чырванеюць кроплямі ў траве. Усе ягады спелыя і смачныя. (17 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Пліска**

Спінка ў пліскі шэрая. На галоўцы чорная шапачка. Крыльцы ўпрыгожваюць белыя палоскі. Ножкі ў птушкі тонкія і доўгія. (19 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Абед**

Маці прыгатавала абед. Бацька нарэзаў хлеб. Міша паставіў міскі. Таня наліла суп. У госці прыйшлі суседзі. Яны прынеслі торт. (20 слоў)

#### II КЛАС

**Дыктант**

**Знаходлівая галка**

Галка хацела піць. На двары стаяў гарлач з вадой. Але вада ў ім была толькі на дне. Галка не магла дастаць яе. Яна стала кідаць у гарлач каменьчыкі. Вада паднялася. Цяпер знаходлівая птушка магла напіцца. (37 слоў)

*Паводле Л. Талстога.*

**Вавёрка**

Вавёрка лушчыла на дрэве шышку. Раптам шышка выпала з лапак звяркі. Яна ўпала ў траву побач з елкай. А насенне ў шышкі смачнае! Шкада стала вавёрцы такога ласунку. Яна спусцілася па ствале і падняла шышку. (38 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Ліпень**

Ліпень у нас — самы гарачы месяц. Гэта сярэдзіна лета. Дні стаяць спякотныя. Высока ў ясным небе свеціць яркае сонца. Пад яго пякучымі праменямі млее разагрэтая зямля. У палях пад павевамі ветрыку пераліваецца хвалямі жыта. (35 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

Паведаміць пра пастаноўку працяжніка.

#### III КЛАС

**Дыктант з граматычным заданнем**

**Волечка і кветка**

Раніцай Волечка ішла ў школу. Каля дарогі дзяўчынка ўбачыла рамонак. Яна захацела сарваць кветачку і аднесці ў школу. Але раптам на пялёстку Волечка заўважыла кропельку расы. А там пераліваліся сонца, неба і зялёная ніва. Загледзелася дзяўчынка на расінку і не сарвала рамонак. (46 слоў)

*Паводле В. Сухамлінскага.*

Паведаміць пра пастаноўку коскі.

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце па саставе слова:
   расінку *(I варыянт)*;
   зялёная *(II варыянт)*.

2. Вызначце род назоўнікаў у сказе:
   А там пераліваліся сонца, неба і зялёная ніва *(I варыянт)*;
   Загледзелася дзяўчынка на расінку і не сарвала рамонак *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   Каля дарогі дзяўчынка ўбачыла рамонак *(I варыянт)*;
   Раніцай Волечка ішла ў школу *(II варыянт)*.

### Лівень

Пасля абеду на небе паказалася чорная хмара. Згарнуліся ў бутоны кветкі. Пахаваліся камары. Заціхлі птушыныя спевы. Толькі нізка над зямлёй лёталі ластаўкі.

Хмара расла. Хутка яна засланіла сабою сонца. Раптам блiснула маланка. У паветры пракаціўся моцны гром. Здрыганулася пад нагамі зямля. Хлынуў лівень. Так пачалася навальніца. (47 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Граматычнае заданне**

1. Разбярыце па саставе слова:
   чорная *(I варыянт)*;
   птушыныя *(II варыянт)*.

2. Вызначце лік назоўнікаў у сказе:
   Толькі нізка над зямлёй лёталі ластаўкі *(I варыянт)*;
   Здрыганулася пад нагамі зямля *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   Згарнуліся ў бутоны кветкі *(I варыянт)*;
   Заціхлі птушыныя спевы *(II варыянт)*.

### Вясной

Вось і прыйшла вясна. Прырода абудзілася. Вярба ўсыпана пухнатымі коцікамі. На бярозках лопаюцца першыя пупышкі. З іх выбіваюцца клейкія кончыкі зялёных лісточкаў. На асінках вісяць срэбныя пацеркі. На высокіх кустах алешніку красуюць шышачкі.

Ажываюць пад сонцам лясныя палянкі. Сярод леташняга лісця на тоненькіх сцяблінках цвітуць пралескі. (47 слоў)

*Паводле З. Бяспалага.*

**Граматычнае заданне**

1. Разбярыце па саставе слова:
   асінках *(I варыянт)*;
   бярозках *(II варыянт)*.

2. Падкрэсліце прыметнікі ў сказе:
   Сярод леташняга лісця на тоненькіх сцяблінках цвітуць пралескі *(I варыянт)*;
   З іх выбіваюцца клейкія кончыкі зялёных лісточкаў *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   Ажываюць пад сонцам лясныя палянкі *(I варыянт)*;
   На высокіх кустах алешніку красуюць шышачкі *(II варыянт)*.

## IV КЛАС

### Дыктант з граматычным заданнем

### Рукавічка

Бабуля сядзела ў садзе і вязала Яшу рукавічку. Клубок нітак катаўся па траве. Побач бегаў коцік. Вельмі хацелася яму з клубочкам пагуляць.

Вязала бабуля рукавічку і заснула. Коцік убачыў клубок у траве і пакаціў. Закаціў яго ў кусты. Яша знайшоў клубок, пачаў намотваць на яго нітку. Доўга матаў Яша нітку.

Прачнулася бабуля і пляснула ў далоні. Ад рукавічкі адзін пальчык застаўся. Яша ўсю рукавічку зноў у клубок пераматаў. (69 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

**Граматычнае заданне**

1. Разбярыце па саставе слова:
   бабуля *(I варыянт)*;
   коцік *(II варыянт)*.

2. Вызначце лік, род і склон назоўнікаў у сказе:
   Клубок нітак катаўся па траве *(I варыянт)*;
   Яша ўсю рукавічку зноў у клубок пераматаў *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   Бабуля сядзела ў садзе і вязала Яшу рукавічку *(I варыянт)*;
   Прачнулася бабуля і пляснула ў далоні *(II варыянт)*.

### Барсук

Схованку барсук звычайна робіць каля рэчкі ці балота. Днём ён не вылазіць са сваёй нары. Звярок здабывае сабе корм увечары ці ноччу. Ён ловіць мышэй і жаб, чарвякоў і насякомых. Яшчэ ласуецца барсук дзікімі яблыкамі, грушамі, карэннем раслін.

А на світанні звярок спяшаецца ў сваю нару. Там яго чакаюць галодныя барсучаняты. Барсукі — клапатлівыя бацькі. Яны носяць малым ежу. Адважна бароняць іх ад лясных разбойнікаў. (65 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

Паведаміць пра пастаноўку працяжніка.

**Граматычнае заданне**

1. Разбярыце па саставе слова:
   лясных *(I варыянт)*;
   звярок *(II варыянт)*.

2. Вызначце лік і склон прыметніка ў сказе:
Там яго чакаюць галодныя барсучаняты *(I варыянт)*;
Адважна бароняць іх ад лясных разбойнікаў *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце аднародныя члены ў сказе:
Ён ловіць мышэй і жаб, чарвякоў і насякомых *(I варыянт)*;
Яшчэ ласуецца барсук дзікімі яблыкамі, грушамі, карэннем раслін *(II варыянт)*.

## Для школ з рускай мовай навучання

### II КЛАС

**Кантрольнае спісванне**

**У пачатку вясны**

Маразы і завеі змяняюцца частымі адлігамі. Паветра яшчэ халоднае і вільготнае. Снег робіцца мокрым і цяжкім. На адкрытых мясцінах паказваюцца першыя праталіны. (25 слоў)

*Паводле В. Вольскага.*

**Лодачка**

Надышла вясна. Пацякла вада. Дзеці ўзялі дошчачкі і змайстравалі лодачку. Пусцілі яе па вадзе. Лодачка паплыла. Радасныя дзеці беглі за ёй. (22 словы)

*Паводле Л. Талстога.*

**Ліпы**

Красуюць ліпы. У пышных кронах дрэў цэлымі раямі гудуць пчолы. Прылятаюць сюды паласавацца нектарам чмялі. Усіх адорваюць ліпы сваёй дабрынёй. (21 слова)

*Паводле Я. Галубовіча.*

**Пасля дажджу**

Дождж перастаў. Узрадавалася сонейка. Засвяціла ярчэй. Пацяклі жвавыя ручайкі. У лужынах пачалі купацца вераб'і. У паветры запахла свежасцю. На небе з'явілася вясёлка. (24 словы)

*Паводле Я. Галубовіча.*

### III КЛАС

**Дыктант з граматычным заданнем**

**Грыбная пара**

Прайшоў цёплы дождж. Зямля наталіла смагу. А грыбнікі сабраліся ў лес. Пасля дажджу ў бярэзніках багата падбярозавікаў. У асінніках чырванеюць шапачкі падасінавікаў. У хвойніках цэлымі лапінамі сустракаюцца жоўтыя лісічкі. У змешаных лясах можна натрапіць на сямейку груздоў. (39 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

***Граматычнае заданне***

1. Знайдзіце аднакаранёвыя словы ў сказе і абазначце ў іх корань:
Пасля дажджу ў бярэзніках багата падбярозавікаў *(I варыянт)*;
У асінніках чырванеюць шапачкі падасінавікаў *(II варыянт)*.

2. Вызначце лік назоўнікаў у сказе.
У хвойніках цэлымі лапінамі сустракаюцца жоўтыя лісічкі *(I варыянт)*;
У змешаных лясах можна натрапіць на сямейку груздоў *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
Прайшоў цёплы дождж *(I варыянт)*;
Зямля наталіла смагу *(II варыянт)*.

**Дожджык**

Сыпануў летні дожджык. Буйныя кроплі заскакалі па траве. Жучкі хаваюцца ад дажджу пад лістамі дрэў. Матылькі залезлі ў чашачкі кветак. Мышка прытаілася пад мухаморам. Птушкі ў дуплы пахаваліся. Жабы скокнулі ў ваду. Усе гуляюць у хованкі з дожджыкам. (39 слоў)

*Паводле В. Хомчанкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце па саставе слова:
матылькі *(I варыянт)*;
жучкі *(II варыянт)*.

2. Вызначце час дзеяслова ў сказе:
Буйныя кроплі заскакалі па траве *(I варыянт)*;
Жучкі хаваюцца ад дажджу пад лістамі дрэў *(II варыянт)*.

3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
Птушкі ў дуплы пахаваліся *(I варыянт)*;
Мышка прытаілася пад мухаморам *(II варыянт)*.

**Мурашкі**

Вакол мурашніка заўжды кіпіць работа. Мурашкі дружна цягнуць сухія галінкі і кавалачкі кары. Яны

рамантуюць сваё жыллё. У гэты час іх браты спяшаюцца дамоў. Яны цягнуць вусеняў і караедаў. Мурашкі знішчаюць дробных лясных шкоднікаў. (35 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце па саставе слова:
   мурашкі *(I варыянт)*;
   галінкі *(II варыянт)*.
2. Падкрэсліце:
   назоўнікі ў сказе "Вакол мурашніка заўжды кіпіць работа" *(I варыянт)*;
   прыметнікі ў сказе "Мурашкі знішчаюць дробных лясных шкоднікаў" *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   У гэты час іх браты спяшаюцца дамоў *(I варыянт)*;
   Вакол мурашніка заўжды кіпіць работа *(II варыянт)*.

## IV КЛАС

### Дыктант з граматычным заданнем

#### Лісіная навука

Лісяняты нараджаюцца вясной. Праз два месяцы яны становяцца жвавымі, цікаўнымі звяркамі. Маці бяжыць на паляванне і пакідае іх адных. Сумна малым сядзецъ у цёмным сховішчы. Яны вылазяць з нары і гуляюць у даганялкі.

Любяць лісяняты пазабаўляцца і з матулiным хвастом. Гэта сапраўдная лісіная навука. Так звяркі вучацца лавіць палявых мышэй, кратоў і жаб. (55 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце па саставе слова:
   лісіная *(I варыянт)*;
   палявых *(II варыянт)*.
2. Вызначце склон назоўнікаў у сказе.
   Любяць лісяняты пазабаўляцца і з матулiным хвастом *(I варыянт)*.
   Яны вылазяць з нары і гуляюць у даганялкі *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   Яны вылазяць з нары і гуляюць у даганялкі *(I варыянт)*;
   Маці бяжыць на паляванне і пакідае іх адных *(II варыянт)*.

#### У маі

Майскае сонца радавала зямлю ласкавым цяплом. Паўднёвы вецер часта прыносіў з сабой дажджавыя хмары. Пасля дажджу ўсё ажывала, напаўнялася прыгажосцю.

Бярозы, асіны і вербы апрануліся ў зялёныя сарафаны. У лесе на пагорках пачала расці трава. Яна вострымі іголкамі прабівала леташняе лісце. На балотах з вады паказаліся пікі асакі. Побач відаць стрэлкі хвашчу. Прыгожа зазелянеў луг. (57 слоў)

*Паводле З. Бяспалага.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце па саставе слова:
   ласкавым *(I варыянт)*;
   майскае *(II варыянт)*.
2. Вызначце склон прыметнікаў у сказе:
   Паўднёвы вецер часта прыносіў з сабой дажджавыя хмары *(I варыянт)*;
   Майскае сонца радавала зямлю ласкавым цяплом *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце аднародныя члены ў сказе:
   Пасля дажджу ўсё ажывала, напаўнялася прыгажосцю. *(I варыянт)*;
   Бярозы, асіны і вербы апрануліся ў зялёныя сарафаны. *(II варыянт)*.

#### Мая рабінка

Аднойчы я прынёс з лесу рабінку. Мы пасадзілі дрэўца каля хаты. Расло яно вельмі хутка. Праз тры гады ў маі рабінка зацвіла. Лёгкі ветрык разносіў прыемны водар яе кветак. Цэлы дзень вакол іх лягалі пчолкі. З галінкі на галінку скакалі шустрыя вераб'і. У канцы ліпеня на рабінцы з'явіліся гронкі ягад. Глядзеў я на рабінку і радаваўся. (58 слоў)

*Паводле Я. Галубовіча.*

***Граматычнае заданне***

1. Разбярыце па саставе слова:
   пчолкі *(I варыянт)*;
   рабінка *(II варыянт)*.
2. Вызначце род, лік і склон назоўнікаў у сказе:
   Мы пасадзілі дрэўца каля хаты *(I варыянт)*;
   Аднойчы я прынёс з лесу рабінку *(II варыянт)*.
3. Падкрэсліце галоўныя члены ў сказе:
   Цэлы дзень вакол іх лягалі пчолкі *(I варыянт)*;
   З галінкі на галінку скакалі шустрыя вераб'і *(II варыянт)*.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ імя М. Танка.



*На дыску — тэксты для кантрольнага спісвання.*